Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 ЧЭРВЕНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 107 (29987)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



ТАЙНЫ ВЫШЫНІ

МС

ЯК СПЫНІЦЬ ЦУКРОВЫ ДЫЯБЕТ

12



## КОРАТКА

• **Аляксандр Лукашэнка адобрыў праект пагаднення аб свабодным гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый у СНД.**

• Гандлёвую пляцоўку для рэалізацыі прадукцыі лясгасаў адкрылі ў Бабруйску.

• **Продажы новых аўтамабіляў у Беларусі ў маі выраслі больш як у два разы.**

• У гэтым годзе ва ўстановы вышэйшай адукацыі ў цэлым плануецца прыняць больш за 50 тысяч чалавек.

• **Беларусь займае другое месца па лясістасці сярод краін СНД.**

• Абласныя туры сямейнага сельгаспраекта «Уладар вёскі» стартуюць 16 чэрвеня.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр КУЛІК, міністр лясной гаспадаркі:**

*«Задача па насычэнні ўнутранага рынку прадукцыяй лесаперапрацоўкі, пастаўленая кіраўніком дзяржавы і прэм'ер-міністрам, стала вызначальнай у развіцці гандлёвай сеткі. Мы ўзялі на сябе гэтае абавязацельства і паспяхова яго выконваем. Адкрылася ўжо 13-я гандлёвая пляцоўка ў краіне. Самая галоўная задача — асартымент. Грамадзянін, які едзе на дачу, павінен мець магчымасць набыць усе асноўныя драўляныя канструкцыі ў адным месцы. Мы павінны таксама прапанаваць комплекс спадарожных тавараў і паслуг».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «МАЁ ГАЛОЎНАЕ ПАТРАБАВАННЕ — ГЭТА СПРАВЯДЛІВАЕ СТАЎЛЕННЕ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па бягучых пытаннях уступнай кампаніі, з-за якіх на мінулым тыдні ўзнялася «цэлая буча». Нагадаем, на мінулым тыдні падчас кадравых прызначэнняў кіраўнік дзяржавы пракаментаваў сітуацыю з цэнтралізаваным экзаменам і раскрытыкаваў сістэму падліку балаў. Усё пачалося з таго, што пасля правядзення ЦЭ па беларускай і рускай мовах сталі паступаць шматлікія звароты ад дзяцей і бацькоў з просьбай растлумачыць, чаму атрыманы бал у некаторых выпадках ніжэйшы, чым падчас рэпетыцыйнага экзамену. Прэзідэнтам была пастаўлена задача праверыць арганізацыю цэнтралізаваных экзаменаў і ўдакладніць атрыманыя вынікі. У той жа дзень, 30 мая, была сфарміравана міжведамасная камісія для праверкі карэктнасці апрацоўкі вынікаў першага цэнтралізаванага экзамену. Па выніках яе работы 2 чэрвеня Міністэрства адукацыі паведаміла, што вынікі першага цэнтралізаванага экзамену пералічаць па новай методыцы.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

Падзея

# Аснова харчовай бяспекі



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Учора ў Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень» адкрылася 33-я Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «Белагра-2023»**

**Беларусь адкрыта для супрацоўніцтва з усімі краінамі — удзельніцамі выстаўкі «Белагра-2023», заявіў намеснік прэм'ер-міністра Леанід ЗАЯЦ падчас старту Беларускага агpапрамысловага тыдня.**

СТАР. 5

Дзяржаўны інтарэс

# ЧАС МАГЧЫМАСЦЯЎ

## Чым жыве айчынная лёгкая прамысловасць?

**Тэма лёгкай прамысловасці выйшла на першы план у апошнія гады ў сувязі з сыходам з беларускага і расійскага рынкаў замежных брэндаў, якія належаць да адзежнага рытэйлу, вытворчасці тавараў для дома, галантарэі і г. д. І хоць сёння замежныя кампаніі паступова вяртаюцца на наш і расійскі рынак (або думаюць пра гэта), беларускія вытворцы досыць паспяхова запаўняюць нішы, якія вызваліліся. Для гэтага ў іх ёсць і магчымасці, і тэхналогіі, і крэатыў.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X
23107>
9 771990 763008

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!